**Материал и методы.** Источниками для разработки маршрута послужили достопримечательности города Витебска. Методической основой стали работы по экскурсоведению Б.В. Емельянова [1] и Н.А. Чирского [4], а также публикации Т.Б. Лисициной [2] и И.В. Ризенько [3], посвященные особенностям проведения детских экскурсий.

**Результаты и их обсуждение.** Разработанная нами детская экскурсия по г. Витебску «Сказки. Приключения. Тайны» является одним из вариантов продвижения местного туристического продукта. Цель экскурсии – популяризация историко-культурного наследия Витебска среди детской аудитории. Задачи: привить школьникам новые знания посредством экскурсии и игровых моментов в ней; воспитывать патриотизм, любовь к малой родине, способствовать расширению кругозора и эстетическому воспитанию детей.

Для раскрытия темы экскурсии были отобраны уникальные объекты, связанные со знаменитыми людьми Витебщины, сказками и легендами города. Основными объектами показа стали: скульптура старика Хоттабыча, памятник А.С. Пушкину, романтическая скамейка, Пушкинский мост, скульптура Золотой Рыбки и Успенский собор, фонарь с «Дядей Витей», скульптура Ф. Махнова, Витебская Ратуша и памятник Ольгерду.

Поскольку экскурсии детская, важно, чтобы в ней не было длительных переходов, поэтому все объекты расположены близко к друг другу. По маршруту экскурсия начинается с улицы Пушкина, ранее там было основание Замковой горы, там экскурсанты узнают об основании нашего города и о легендах, а последним пунктом программы выступил памятник князю Ольгерду. Общая протяжённость маршрута – 1,1 км.

В проведении экскурсии применяются методические приёмы локализации событий, зрительного сравнения, литературного монтажа, которые позволили сделать экскурсию более насыщенной, яркой, информативной и легко воспринимающейся.

Чтобы детям было интереснее, и они легче усваивали информацию, было решено провести экскурсию в игровой форме: были включены игры, стихотворения, загадки, ребусы. Также во время экскурсии дети получали фрагмент карты, и в конце собрали чертёж города Витебска 1664 года.

Разработка прошла апробацию. Во время акции «Любимому городу посвящается» 14 и 15 июля 2018 г. были проведены две экскурсии, на которых присутствовали от 10 до 15 человек. Также экскурсия была проведена в рамках краеведческой акции «Фест экскурсоводов» 13 апреля 2019 г., на которой присутствовала более 25 человек. Тот факт, что присутствовали и активно участвовали не только дети, но и их родители, позволяет сделать вывод о том, что тема интересна и что подобные экскурсии востребованы.

**Заключение.** Таким образом, нами была разработана детская экскурсия «Сказки. Приключения. Тайны», в которую были включены наиболее значимые и интересные детям городские достопримечательности. Данный продукт может быть востребован учреждениями дополнительного образования детей и молодежи, музеями города, туристическими предприятиями.

1. Емельянов, Б. В. Экскурсоведение [Электронный ресурс] / Б. В. Емельянов // Все о туризме. Туристическая библиотека. – Режим доступа: https://clck.ru/G4TnN. – Дата доступа: 24.04.2019.
2. Лисицына, Т. Б. Экскурсия – педагогический процесс [Электронный ресурс] / Т.Б. Лисицина // Молодой ученый. – 2012. – № 6. – Режим доступа: https://clck.ru/G4ToF. – Дата доступа: 20.04.2019.
3. Ризенько, И. В. Методика организации экскурсий для школьников [Электронный ресурс] / И. В. Ризенько // Социальная сеть работников образования. – Режим доступа: https://vk.cc/85LffA. – Дата доступа: 22.04.2019.
4. Чирский, Н. А. Экскурсоведение. Основы экскурсионной деятельности / Н. А. Чирский. – Минск : РИВШ, 2016. – 282 с.

## ЗАХАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

***Кроцікава М.В.,***
*магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Цімафееў Р.Ул., канд. гіст. навук, дацэнт*

Сярод надзенных пытанняў у кантэксце ўсіх працэсаў мадэрнізацыі і глабалізацыі сучаснага грамадства Рэспублікі Беларусь застаюцца праблемы захавання беларускай традыцыйнай культуры ў кожным рэгіёне краіны, папулярызацыі яе сярод шырокіх слаёў насельніцтва, выкарыстання творчага патэнцыялу ў працы з дзецьмі і моладдзю. У якасці негатыўных аспектаў



Репозиторий ВГУ

глабалізацыі разглядаюцца працэсы замяшчэння каштоўнасцей традыцыйнай культуры каштоўнасцямі глабальнай культуры, крызіс культурнай ідэнтычнасці ў сучасным свеце.

Мэта даследавання – ахарактарызаваць працэс глабалізацыі як мнагамерны і шматаспектны працэс, які наклаў адбітак на развіццё і фарміраванне традыцыйнай культуры беларусаў, вызначыць і прааналізаваць дасягненні дзяржавы па захаванні традыцыйнай культуры.

**Матэрыял і метады.** У ходзе працы над тэмай даследавання былі выкарыстаны матэрыялы айчынных і замежных даследчыкаў па дадзенай праблеме: Л.В. Жарынай, Л.В. Дземінай. Робяцца адсылкі на матэрыялы заканадаўчага характару РБ: Пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь "Культура Беларусі" на 2016–2020 гады, Закон аб культуры ў РБ і інш. Выкарыстоўваліся такія агульнанавуковыя метады, як апісанне, аналіз, сінтэз.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Беларуская традыцыйная культура складвалася тысячагоддзямі, беражліва захоўвалася мноствам пакаленняў. Важна адзначыць, што ў сваім развіцці традыцыйная культура Беларусі прайшла шмат этапаў, фарміравалася пад уплывам розных фактараў мінулага. Гэта гістарычныя перыяды, калі беларускія землі знаходзілася ў складзе ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імеперыі. Бясспрэчна, гэтыя падзеі наклалі адбітак не толькі на гістарычны, сацыяльна – эканамічны, але і культурны лёс Беларусі.

Працэсы глабалізацыі ахапілі ўсе сферы жыцця грамадства, магутнымі і супярэчлівымі фактарамі глабалізацыі ў сучасных умовах з'яўляюцца тэлебачанне і інтэрнэт, якія ўсе больш фарміруюць грамадскую свядомасць. З умацаваннем працэсаў глабалізацыі захаванне традыцыйнай культуры беларусаў будзе ўсе больш і больш праблемнай [1, с. 121]. Аб гэтым сведчыць тое, што да нядаўняга часу традыцыі мінулага забываліся хуткімі тэмпамі, іх выкарыстанне ў жыцці грамадства ўсе больш і больш змяншалася. Сёння ўзрасла цікавасць насельніцтва да нацыянальнай культурнай спадчыны, да традыцыйных форм культуры і быту. Дзяржаўная палітыка ў галіне культуры грунтуецца на прызнанні культуры ў якасці аднаго з галоўных фактараў самабытнасці беларускага народа, іншых нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, пераемнасці пакаленняў, а таксама ў якасці асновы развіцця і самарэалізацыі асобы, адукацыі і выхавання дзяцей і моладзі [3]. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2018 г. № 247, 2018-2020 гады будуць праведзены ў краіне пад знакам Года малой радзімы. Прыняты дакумент накіраваны на: стымуляванне сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў; фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў насельніцтва; захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны [5]. Асноўнымі напрамкамі ўзаемадзеяння дзяржавы і культуры з'яўляюцца: захаванне нацыянальнай культурнай спадчыны, развіццё рэгіянальных культур, актуалізацыя міжкультурнага дыялогу паміж living рознымі этнічнымі супольнасцямі ўнутры краіны і на міжнароднай арэне, падтрымка народнай творчасці, садзейнічанне наватарству і абнаўленню ў культуры: грамадзяне, якія належаць да любой нацыянальнай супольнасці і пражываюць у РБ, маюць права захоўваць і развіваць сваю нацыянальную культуру, выхоўваць дзяцей у нацыянальных культурных традыцыях, карыстацца роднай мовай [3].

Адначасова з працэсамі інтэграцыі ў сусветную эканамічную і культурную прастору, Беларусь пастаянна сутыкаецца з неабходнасцю выпрацоўкі дзяржаўных ідэйна-культурных установак, здольных захаваць культурную разнастайнасць і самабытнасць, гісторыка-культурныя традыцыі, якія дазваляюць у працэсе інтэграцыі абараніць і захаваць нацыянальную самасвядомасць, гісторыка-культурную спадчыну і менталітэт сваіх народаў ад разбуральнага ўплыву глабалізацыі і змяненняў, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве [2, с. 60]. Дзяржпраграма «Беларусы ў свеце» забяспечвае комплекснае ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх арганізацый Рэспублікі Беларусь з беларусамі замежжа, прыцягненне беларусаў да ўдзелу ў рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь, захаванне і падтрымку яе нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, садзейнічанне вывучэнню беларускай мовы ў краінах замежжа [4]. Аб'яднанне і сістэматызацыя розных напрамкаў мэтанакіраванай працы з беларусамі замежжа, якая ажыццяўляецца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, дазваляюць больш эфектыўна выкарыстоўваць патэнцыял беларускай дыяспары для папулярызацыі за мяжой дасягненняў беларускай традыцыйнай культуры і беларускай мовы, духоўных каштоўнасцей беларускага грамадства.

Народная традыцыйная культура ў цяперашні час выконвае важную ролю ў фарміраванні духоўнага аблічча людзей сучаснага грамадства. Сіла яе ўплыву ў тым, што ў ёй заключаны багаты жыццёвы матэрыял, мудрасць і жыццёвы вопыт папярэдніх пакаленняў. Традыцыйная

Репозиторий ВГУ

культура ўяўляе сабой сферу канцэнтрацыі калектыўнага вопыту мінулага і нараджэння інавацый, якія забяспечваюць адаптацыю традыцыйных культурных нормаў да зменлівых умоў існавання этнасу ва ўмовах глабалізацыі.

**Заключэнне.** У эпоху, звязаную з супярэчлівымі працэсамі глабалізацыі, якая з нарастаючай сілай уніфікуе культуры розных народаў, не можа не актуалізавацца праблематыка захавання традыцыйнай народнай культуры. А таму дзяржава надае вялікую ўвагу вывучэнню, захаванню і папулярызацыі традыцыйнай культуры, выпрацоўваецца шэраг прапаноў органамі дзяржаўнага кіравання і зацікаўленымі структурамі. Вырашэнне сучасных праблем патрабуе сістэмнай і скаардынаванай працы ўсіх зацікаўленых бакоў, падтрымкі і папулярызацыі на ўсіх ўзроўнях. Традыцыйная культура – аснова духоўнага развіцця грамадства, сховішча інтэлектуальных і духоўных сіл народа, гарант захавання яго маральнага здароўя. Сёння немагчыма не ўлічваць культурны фактар пры рэалізацыі маштабных задач дзяржаўнага будаўніцтва. Высокі культурны ўзровень насельніцтва, апора на маральныя каштоўнасці і традыцыі народа, якія ствараліся стагоддзямі, павінны стаць асновай фарміравання паспяховага культурнага, палітычнага і эканамічнага развіцця краіны.

Традыцыцыйная культура ўтварае сукупнасць поглядаў і каштоўнасцяў, якія існуюць доўгі час, яна элемент устойлівай сувязі паміж мінулым, сучасным і будучым. А таму вельмі важна не дапусціць, каб працэсы глабалізацыі пацягнулі за сабой знікненне традыцыйных сувязяў, што ўяўляе сабой сур'ёзную пагрозу для ўсяго чалавецтва.


1. Демина Л. В. Сохранение традиционной народной культуры в современном обществе. - Теория и практика общественного развития. - 2011, № 2.-С. 121-125
2. Жарина Л.В. Проблема сохранения культур в условиях глобализации.- Труды БГУ (История, философия. - 2014. - №5.- С. 60-62.
3. Закон РБ Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў РБ».- [Электронный ресурс]. - /Режим доступа http://livingheritage.by/ kultury.pdf.- Дата доступа 04.09.2019
4. Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 4 марта 2016 года №180 Об утверждении Государственной программы "Культура Беларуси" на 2016-2020 годы. - [Электронный ресурс ].- /Режим доступа: http://base.spinform.ru/show_doc.fwx?rgn=84909.- Дата доступа 03.09.2019
5. Указ Президента Республики Беларусь о проведении Года малой родины. - [Электронный ресурс ]. - /Режим доступа http://president.gov.by/uploads/documents/2018/247uk.pdf.- Дата доступа 05.09.2019


## ДАСЛЕДАВАННЕ ЦЫГАНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў БССР У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД


***Крэнт Дз.А.,***

*аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік – Тугай У.В., доктар гіст. навук, прафесар*


Нацыянальная палітыка ў БССР, што здзяйснялася на працягу 1920 – першай паловы 1930-х гг., садзейнічала ўключэнню ва ўсе сферы жыцця краіны прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей, якія пражывалі на абшарах Савецкай Беларусі. Апошняе стала штуршком для арганізацыі даследаванняў, прысвечаных нацыянальным меншасцям ў Беларусі. Так, пры Інстытуце беларускай культуры (з 1929 г. Беларуская акадэмія навук) функцыянавалі даследчыя адзінкі па вывучэнню культуры, мовы і гісторыі латышоў, літоўцаў, палякаў і яўрэяў. Разам з тым, выклікае інтарэс асветліць спробы арганізацыі навуковых даследаванняў у адносінах да нацыянальнасцей, якія не былі патрыманы дзейнасцю канкрэтных інстытуцый.

Мэтай дадзенай работы з'яўляецца акрэсліць ініцыятывы па даследаванню цыганскага насельніцтва ў Савецкай Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання сталі працы міжваеннага перыяду прысвечаныя цыганскаму насельніцтву ў Беларусі, а таксама архіўныя дакументы і матэрыялы мемуарнага характару. Пры напісанні работы выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз), так і спецыяльна-гістарычныя метады даследавання (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Першая спроба асэнсаваць ролю і месца цыганскага насельніцтва ў Беларусі пасля Першай сусветнай вайны была зроблена у падручніку А. Смоліча "Геаграфія Беларусі" (1919). У асобным параграфе, які быў прысвечаны нацыянальным мен-



Репозиторий ВГУ